znaky na jakesi krizovatce, ktera svou mnohofunkcnosti umoznuje ucastnikum nasi akce vlastni volbu z rady moznosti (napr. symboly zvon, gong, boure, ticho atd.).

Popisovana technika pocita take s indukcnimi prvky. Jsou to ty pryky nasi esteticke akce, ktere maji mimoradnou moznost vyvolavat tvorive predstavy v jinem umeleckem oboru (napr. hudebni podnety impresio-nistickych obrazu, pohybove ponety barokni hudby, Manesovych kreseb, mnohasmerne vyuzivani urcitych typu zvukomalby apod).

Pri priprave ucitelu ve specializovanem seminari mame nyni pocitace Appel, na nichz muzeme vytvaret hudebne esteticke modely, do kterych studenti vstupuji svymi improvizovanymi a imitovanymi postupy. Ve studijnich textech pro nase studenty mame strukturu nekolika seminarnich lekci a zpracovany kulturne vychovny program "Od pocitadla k pocitaci", ktery byl prakticky overen na 1. a 2.stupni skol. Pro zdurazneni mnohavyznamovych symbolu lze se zdarem vauzivat predem pripravene kineticke objekty. Ty jsou aktivnimi ucastniky imitacnich a improvizacnich postupu tim, ze podnecuji k akci a k manipulaci. Je to napriklad prostorova figuri na, s niz je mozno tancit, rytmicky pohybovat, menit jeji polohy, parodovat a karikovat. Overili jsme si, ze takovych objektu lze s uspechem pouzivat na vsech stupnich skol.

Je prirozene, ze tyto esteticko vychovne postupy srustaji s zivotem mimo skolu. Ozvlastnuji kazdodenni sed a svym zpusobem mohou vstupovat do zivotniho stylu. Cini tak nejen tim, ze vyuzivaji mimoskolnich podnetu, ale take tim, ze imitacni hra pokracuje napr. v neformalnich folklornich souborech ci ruznych zajmovych sdruzenich.

Existuje narocnejsi forma imitacni a improvizacni vychovy na principu tzv. hudebni grafiky. Take tento technikam se na ostravske pedagogicke fakulte venujeme v seminari "Tvorba kulturne vychovnych a umeleckych programu". Jde o jednoduche nedo slozitejsi improvizace na konkretni vytvarny artefakt (vetsinou jde o grafiku se zjevnym nedo latentnim hudebnim obsahem.

Venovali jsme se nekterym novym a netradicnim cychocnym metodam, ktere souviseji s univerzalni funkci hudby a mezidruhovymi umelecymi vztahy obou terminu: imitace jako nahrazka a improvizace jako nepripravenost. Avsak z kulturne historickeho hlediska je nutno povazovat zminene pojeti obou terminu jako pomerne pozdni a velmi obvozene - druhotne. Puvodni chapani je nasemu pojeti velmi blizke, imitace = znovuproziti s vyraznju peceti okamziku.

Nejde o postupy bez radu a zakonitosti, ale o kroky se zakonitostmi specifickymi, ktere umoznuji vetsi osobni angazovanost zaku i ucitelu.Nove rozvijtji kreativitu. Dalo by se kratce rici, ze chteji byt animaci - odustvnenim kultury.

A hledat v kulturnich hodnotach stale nove rozmery, to je radostny ukol umelecke pedagogiky bez ohledu na narodni specifika a statni hranice. Je to stale aktualni a hluboce humanisticky ukol esteticke vychovy.

Трамбіцкая В.І.,
ст.выкладчык

## УДАСКАНАЛЕННЕ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКОЎ ДЗІЦЯЧЫХ ФАЛЬКЛОРНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ У ВНУ

Вывучэнне народнай творчасці сёння стала адным з галоўных накірункаў дзейнасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў народна-інструментальнай спецыялізацыі. Неабходнасць гэтага не выклікае сумненняў, бо адметнай рысай сучаснасці стала вялікая цікавасць грамадства да нацыянальнай культурнай спадчыны. Актуальнасць вывучэння фальклору тлумачыцца тым, што ён усё больш асэнсоўваецца як самабытны фактар духоўнасці, найбольш своеасаблівая частка нацыянальнай культуры. Таму ў галіне музычнай адукацыі ўзніклі праблемы, звязаныя са змяненнем культурнай сітуацыі, якую трэба ўлічваць у падрыхтоўцы спецыялістаў. Сёння, на нашу думку, назіраецца значны разрыў паміж навуковымі ведамі аб фальклоры і асаблівасцямі яго асэнсавання як у практыцы самадзейных калектываў, так і ў выкладанні фальклору ў навучальных установах, якія рыхтуюць кадры для гэтай практыкі.

Адно з прынцыповых пытанняў, якое паўстала ў сувязі з гэтым перад ВНУ, як знайсці адпаведныя шляхі "перакладу" фальклорнага музычнага вопыту ў сучаснае прафесійнае навучанне, вызначыць асаблівасці яго засваення.Вядома, што фальклор як сістэма характарызуецца пэўнай своеасаблівасцю, якая перашкаджае паўнацэннаму ўспрыманню яго сучаснымі музы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кантамі, атрымаўшымі акадэмічную адукацыю. Аднак каштоўнасці фальклору (эстэтычныя, маральныя) падаюцца надзвычай актуальнымі для вывучэння і засваення маладымі музыкантамі, бо наладжаная ў нас музычная адукацыя вызначаецца сваёй аднабаковасцю, накіраванасцю на рэпрадуктыўныя формы. Фальклор жа садзейнічае ліквідацыі гэтай аднабаковасці, асабліва калі мы імкнемся выхаваць здольнасці да ўласнай творчасці ў кожнага студэнта. Гэта асабліва неабходна сёння, бо ад спецыяліста патрабуецца добрая адаптацыя да новых патрабаванняў практыкі ў галіне культуры.

Адно з такіх патрабаванняў - неабходнасць увядзення фальклору ў практыку дзіцячых музычных калектываў рэспублікі. Засваенне фальклору дзецьмі - гэта не толькі сродак адраджэння і захавання народнай спадчыны, але і найважнейшы сродак гуманнага, маральнага, мастацкага выхавання нашых нашчадкаў. Таму важнае месца ў падрыхтоўцы кіраўнікоў самадзейных калектываў, арыентаваных на фальклор, павінна адвесціся менавіта падрыхтоўцы да работы з дзецьмі. Кіраўнік сучаснага дзіцячага фальклорнага калектыву з'яўляецца галоўным носьбітам функцыі сувязі паміж фальклорам і дзецьмі, якія яго засвойваюць. У працэсе сваёй дзейнасці кіраўнік шукае і адбірае фальклорны матэрыял, актуалізуе яго, перадае дзецям яго каштоўнасці, вучыць асновам традыцыйнага выканання. Таму ён павінен умець стварыць такія ўмовы, якія спрыяюць павышэнню эфектыўнасці працэсу засваення фальклору ў дзіцячым калектыве.

Адна з такіх умоў - валоданне кіраўніком уменнямі фальклорнай творчасці, спецыфікай музычнага мыслення народных музыкантаў. Здольнасць адэкватна ўспрымаць фальклор, рэагаваць на музыку вуснай традыцыі важная яшчэ і таму, што пры гэтым з'яўляюцца абумоўленыя эмацыянальныя асацыяцыі, якія замацоўваюцца ў прафесійных навыках. Напрыклад, імправізацыйнасць вызначае спецыфіку фальклорнага выканання. Гэта галіна музычнага мыслення пакуль што мала распрацавана ў выкладанні фальклору. Нам здаецца, што пошукі вусных форм засваення народнай музыкі якраз і здольныя развіць такія навыкі музіцыравання, дзе ўсё залежыць ад непасрэднага творчага ўздзеяння на працэс выканання музыкі. Сучасныя музыканты да гэтага пакуль што не падрыхтаваныя ні псіхалагічна, ні практычна. Вывучаючы прынцыпова іншыя механізмы творчай дзейнасці, не звязаныя са звычным для іх прафесійным мастацкім мысленнем, студэнты навучыліся б успрымаць своеасаблівую якасную спецыфіку традыцыйнага народнага музіцыравання. Таму неабходна ўвядзенне ў навучальны працэс вусных формаў засваення народнай музыкі.

Сярод практыкаў, якія садзейнічаюць адраджэнню фальклору, сёння пашыраецца погляд на фальклор як на цэласную сістэму светаўспрымання, а не проста колькасць "музычных узораў", застаўшыхся з мінулага. На такім разуменні і павінна, на наш погляд, базіравацца падрыхтоўка кіраўнікоў фальклорных калектываў. Таму неабходна знаёміць студэнтаў з фальклорам прынцыпова па-іншаму, чым з музыкай кампазітараў. Вялікую ролю маглі б адыграць тут непасрэдныя кантакты з народнымі музыкантамі, носьбітамі сапраўднай традыцыі. Візуальнае засваенне манеры выканання ў спалучэнні са слыхавым успрыманнем значна пашырылі б разуменне маладымі спецыялістамі асаблівасцей традыцыйнага выканання. Акрамя таго, магчымасць разам памузіцыраваць (у сумеснай з майстрамі музычнай дзейнасці) дапамагае спасціжэнню унутраных працэсаў стварэння музыкі, асэнсаванню таго, што народная музыка - гэта бесперапынны творчы працэс.

Другі бок засваення, што таксама звязаны з вуснымі формамі, -- гэта калектыўны дух творчасці. Агульны зарад энергіі, які ўзбуджаецца народнай музыкай у час яе выканання-стварэння, нараджае стан асаблівага ўздыму, што немагчыма пры засваенні фіксаванай нотамі музыкі. Адчуванне з'яднання з іншымі творцамі ў час калектыўнага выканання дазваляе пранікнуць у механізм пе-раемнасці традыцыі, а спасціжэнне гэтага меха-нізма дазволіць адпаведна пабудаваць работу па засваенні фальклору і ў дзіцячым калектыве. Інакш дзейнасць такого калектыву так і застанецца на ўзроўні развучвання "ўзору музычнага фальклору" па нотных партыях, што, на жаль, і назіраецца ў практыцы многіх дзіцячых народна-інструментальных калектываў.

У практычным плане выказаныя ідэі можна рэалізаваць у навучальным працэсе ВНУ праз курс "Народная інструментальная творчасць", спецкурс "Арганізацыя дзейнасці дзіцячага народна-інструментальнага калектыву фальклорнай арыентацыі", практычныя заняткі па падборы на слых і імправізацыі на спецінструменце, дзейнасць студэнцкіх фальклорна-інструментальных ансамбляў. Своеасаблівасць "фалькларызацыі" навучальнага працэсу, на наш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пoгляд, у тым, каб выкарыстоўваць у навучанні такія прынцыпы, якія склаліся ў самой народнай музыцы.

Карацееў А.Л.,
канд.мастацтвазнаўства,
дацэнт

## СІСТЭМНА-КОМПЛЕКСНАЕ ЗБАЛАНСАВАННЕ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІН ЯК ВАЖНАЯ ЎМОВА ПЕРАЕМНАСЦІ ДВУХУЗРОЎНЕВАГА ПРАЦЭСУ НАВУЧАННЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ (музычныя спецыялізацыі)

Праблема збалансаванасці спецдысцыплін на факультэце мастацкай творчасці павінна вырашацца ў двух напрамках: 1) паэтапнасць і прапарцыянальнасць выкладання дысцыплін на выпускаючых кафедрах; 2) абавязковая арыентацыя на пытанні пераемнасці ўсіх спецыяльных дысцыплін выпускаючых кафедраў і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Для забеспячэння двухузроўневай вышэйшай адукацыі на выпускаючых кафедрах неабходна, на наш погляд, выканаць шэраг дапрацовак у межах новых навучальных планаў падрыхтоўкі бакалаўраў і магістраў, прадстаўленых у дэканат.

1. Так, на кафедры духавой музыкі практычныя заняткі па інструментоўцы трэба працягваць да канца навучання студэнтаў, таму што выпускнікі на дзяржэкзаменах абавязаны прадставіць уласныя інструментоўкі на вялікі змешаны састаў духавога аркестра. Неабходнае раскансэнтраванне па адной гадзіне ў семестры ў цяперашнім плане можна зрабіць без парушэння патыднёвай нагрузкі студэнтаў. А на гадзіны, што вызваліліся (па дзве гадзіны ў І і ІІ семестрах), паставіць заняткі па інструментальнаму ансамблю, якія ў плане прадугледжаны пасярэдзіне тэрміну навучання. Такія змяненні дазволяць забяспечыць студэнтам канцэнтраваную падрыхтоўку па развіцці навыкаў ансамблевага музіцыравання, што, у сваю чаргу, забяспечыць высокі ўзровень сумеснага выканання ў аркестравым класе. Адзначым, што дысцыпліну "Стылізацыя асаблівасцей выканання сучаснай і беларускай народнай музыкі" можна ўключыць у план падрыхтоўкі магістраў.

ІІ. На кафедры эстраднай музыкі рана для вывучэння студэнтамі пастаўлены дысцыпліны "Аркестравая літаратура" (ІІІ семестр), "Рэжысура эстраднага нумара" (ІУ семестр). Гэтыя дысцыпліны больш лагічна вывучаць пасля курса "Методыка работы з аркестрам", з якім іх павінна звязваць сістэмна-комплекснае спалучэнне. У гэтым выпадку навучэнцы ўжо дастаткова авалодаюць тэхналагічнымі момантамі практычнай работы з аркестрам. Мэтазгодна пашырыць змест курса "Методыка работы з аркестрам" за кошт уключэння пытанняў, што тычацца методыкі работы з ансамблямі. Аналагічнае пашырэнне было б апраўданым і для курса "Аркестравая літаратура" за кошт уключэння пытанняў па аналізе рэпертуару для ансамблевых саставаў. Акрамя гэтага, мэтазгодным было б уключэнне ў план такой дысцыпліны, як "Гісторыя эстраднага і джазавага выканання", а для плана па падрыхтоўцы магістраў - "Методыка выкладання дырыжыравання" (аркестрантам).

ІІІ. Планы кафедры народна-інструментальнай творчасці - самыя ўдалыя на факультэце і не патрабуюць асаблівых карэкціровак.

ІУ. На кафедры харавога мастацтва курс "Харавая літаратура" больш лагічна было б назваць "Нацыянальная і сусветная харавая літаратура". Па змесце матэрыял структурна чаргаваўся б па раздзелах, а беларускі раздзел завяршаў бы навучанне студэнтаў, якія маглі б да гэтага часу мець уяўленне аб шырокай панараме сусветнай харавой літаратуры (у плане беларускі матэрыял пазначаны ў У семестры, а за ім размяшчаецца астатні). Змяненні павінны закрануць і дысцыпліну "Дырыжорска-харавая практыка", якая можа вывучацца студэнтамі ўжо з другога курса, а не з трэцяга, як указана ў плане (варыянт для гэтага ёсць: дысцыпліну "Гісторыя і тэорыя харавога мастацтва" перанесці на УІІ-УІІІ семестры). Згодна з новым планам даволі доўга студэнтам давядзецца чакаць і набыцця ведаў па харавой аранжыроўцы. Вывучэнне гэтай дысцыпліны запланавана з УІ семестра (яе можна і трэба ставіць значна раней, прычым гэтаму не перашкаджае патыднёвая нагрузка студэнтаў спецыялізацыі: 14-16 гадзін).

У. Свае рэзервы па сістэмна-комплексным збалансаванні дысцыплін ёсць і на кафедры беларускай народнапесеннай творчасці. Так, дысцыпліну "Фальклорны ансамбль", матэрыял

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ